Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№2 (240). 10 — 16 студзеня 2002г. Масава-палітычны штотыднёвік Наклад 11.200 экз. Кошт 200 руб.

ШТУРМ ГАРАДСКІХ АЎТОБУСАЎ

Фота Віталя ГЛЯ

Такім вось спосабам праходзіла пасадка ў гарадскія аўтобусы на мінулым тыдні ў Слоніме. Бо ў прамежку часу пасля навагодніх святаў і перад Калядамі гарадскі грамадскі транспарт хадзіў вельмі рэдка. І нават дабрацца на працу і з працы дамоў для людзей было праблематычна.

ОФИЦИАЛЬНО

ОБЪЕДИНЯТ ПЯТЬ РАЙОНОВ

В одну территориальную единицу будут объединены некоторые районы и города Беларуси областного подчинения, имеющие общий административный центр.

Соответствующий указ, как сообщают официальные источники, подписал президент Беларуси Александр Лукашенко.

В соответствии с документом в одну административно-территориальную единицу объединяются Слонимский район и город Слоним, Жлобинский район и город Жлобин, Кобринский район и город Кобрин, Речицкий район и город Речица, Светлогорский район и город Светлогорск. В течение месяца Гомельский, Брестский и Гродненский облисполкомы должны определить структуру и штатную численность исполнительных комитетов образуемых административных единиц.

БелаПАН

Чытайце на старонках "ГС"

Падпісацца на "Газету Слонімскую" можна з кожнага наступнага месяца 2002г.

Газета Слонімская
10 — 16 студзеня 2002г. №2 (240)

НАВІНЫ

АКТ ДОБРАЙ ВОЛІ

Чатырнаццаць слонімскіх дзяцей-інвалідаў, хворых на дзіцячы цэрабральны параліч, атрымалі напярэдадні Новага года падарункі ад Дзеда Мароза і Снягуркі.

А павіншавалі дзетак з навагоднімі святамі і Калядамі выхавацель спецыялізаванай дашкольнай установы №17 Наталля Трус і выхавацель дзіцячага сада №16 Ірына Кучура. Сродкі на здзяйсненне гэтага акта добрай волі ахвяравалі слонімскае грамадскае аб'яднанне "Воля да развіцця" і прыватны прадпрымальнік Сяргей Данько.

Мікола КАНАНОВІЧ

ТЭЛЕФОННАЯ СЕТКА – БОЛЬШ ЗА ДВАЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ НУМАРОЎ

Як паведаміла карэспандэнту "ГС" вядучы эканаміст Слонімскага раённага вузла электроннай сувязі Надзея Еўтушэнка, у мінулым годзе ў Слоніме была ўстаноўлена 1111 (у 1999 годзе — толькі 400) новых тэлефонных нумароў, з іх кватэрных — 1065 (360 у 1999 годзе).

Па раёну ўстаноўлена 265 новых нумароў, з якіх 249 — кватэрных. Такім чынам, усяго тэлефонныя сеткі горада і раёна павялічыліся на 1376 нумароў. Цяпер агульная іх колькасць складае 20 003 тэлефонныя нумары: у горадзе — 15 496, у раёне — 4 507. Агульная колькасць кватэрных тэлефонаў склала 17 270: па раёну — 3 570 і 13 700 — па гораду. Калі параўнаць гэтыя лічбы са статыстыкай 1999 года, то атрымліваецца, што за два гады тэлефонная сетка Слоніма павялічылася на 1 033 нумары (14 463 у 1999 годзе). Кватэрных тэлефонаў пабольшала на 1 001 (12 699 у 1999 годзе).

Валерый КАВАЛЕНКА

Курсы обмена валют в г.Слониме по состоянию на 8 января 2002г.

"Приорбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1620	1660
1 EURO	1400	—
1 RUR	52	54
"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1600	1630
1 EURO	1405	1440
1 RUR	50	52
ОАО "Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1610	1650
1 EURO	1250	1450
1 RUR	52	54
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1620	1650
1 EURO	1420	1450
1 RUR	52	54
Нацбанк РБ		
1 EURO	1427.18	

Цены на слонимском рынке по состоянию на 8 января 2002г.

Продукт	Цена за кг
Гранаты	600 (шт.)
Бананы	1500 — 1600
Апельсины	1600 — 1700
Яблоки	600 — 2000
Киви	250 (шт.)
Помидоры	2000
Капуста	450
Морковь	500
Лук	600 — 700
Чеснок	2000
Картофель	220
Молоко	350 (л.)
Творог	900 — 1000
Масло	3200
Яйца	1700 — 2000
Свинина	4500 — 7500
Говядина	4500 — 6000
Баранина	4000 — 5000
Сало	4000
Телятина	4500 — 7000
Мед	5500 — 6000
Сметана	1200
Лимоны	2000
Мандарины	2000

НОВОСТИ

СЛОНИМСКАЯ КРАСАВИЦА НА МОСКОВСКОМ ПОДИУМЕ

Накануне Нового года в Москве прошёл показ одного из крупнейших модельных агентств "Модус Вивендиус". На фестиваль была приглашена и Алла Чак, ученица школы моделей "Леона".

Алина Шаповалова

Алла Чак

— Алла, расскажи, как всё происходило?

— Мы приехали в Москву 28 декабря. Сразу же состоялся кастинг, в результате некоторых девушек отправили домой. А кому улыбнулась, удача заселились в гостиницу "Лужки". Здесь и проходил показ агентства "Модус Вивендиус". С нами работали визажисты, каждой индивидуально подобрали модели для показа. Я демонстрировала купальник и вечернее платье.

— Сколько девочек принимали участие в показе?

— Нас было 36 человек, а это достаточно крупный показ. Девочки приехали из Белоруссии и России.

— Чем закончился вечер?

— 28 декабря был День рождения "Модус Вивендиуса". По этому случаю агентство устроило грандиозную вечеринку. Здесь присутствовали многие российские звёзды эстрады и популярные телеведущие. Мы видели "Иванушек", группу "Hi-Fi", Дмитрия Диброва. Была организована дискотека, в баре все угощения — бесплатные. И что больше всего меня поразило — это очень серьёзное отношение к нам со стороны знаменитостей. Они обращались к нам как к профессиональным моделям.

29 числа, после показа, специально для нас пел Михаил Шуфутинский. После концерта он сидел с нами за одним столиком. И опять же уважительно обращался к девочкам, восхищался нами и даже сказал, что в скором времени он будет брать у нас автограф, а не мы у него.

— Алла, как вы проводили своё свободное время?

— Свободного времени практически не было. Только на следующий день после показа нас отпустили в бассейн и солярии. А так нас ни на минуту не оставляли одних. Директор агентства даже в "люксе" оставался с нами. Видимо, боялся, что нас похитят. Шутка.

— Какие впечатления у тебя остались от показа?

— Всё было великолепно. Мне очень понравилось. Столько знаменитых людей, столько красивых девушек! И мне было очень приятно находиться среди них.

Немного раньше 14 ноября, в Минске на ярмарке Бэлпромэкспо также состоялся показ моделей. Среди участниц была и слонимчанка Алина Шаповалова. Она демонстрировала одежду РОМ "Гиль".

— Алина, какие чувства ты испытывала во время выхода на подиум?

— Конечно же, волновалась. Ведь это мой первый показ. А в основном, всё понравилось, особенно неразбериха за кулисами, когда кто-то занимается макияжем, кто-то причёской, кто-то только-только оделся, а уже пора выходить. Было очень приятно, когда тобой восхищаются окружающие.

С вопросом о дальнейших планах я обратилась к создателю "Леоны" Виталию:

— В феврале в Минске состоится конкурс "Лицо года". На этот показ обязательно поедут Алла Чак и Алина Шаповалова. Через два года у Аллы есть шанс попасть на конкурс "Супер-модель мира". Ну и конечно же, всех желающих заниматься в нашей школе ждём с нетерпением.

Елена ЛЫНЬКО

ЭСЭ

КАГО "ПАСУЦЬ" КАНТРАЛЁРЫ?

У апошнюю нядзелю мінулага года, 30 снежня, Слонім на дзень ператварыўся ў горад-кірмаш. Не толькі гараджане, але і госці раённай сталіцы, якія прыехалі з вёсак, гойсалі па рынку і крамах у пошуку патрэбных прысмакаў на навагодні стол і падарункаў блізкім. Блага, што і прыгарадныя аўтобусы выйшлі ў гэты дзень у рэйсы на ўсе маршруты.

Ды колькі таго зімовага дня? Можна параўнаць, хіба, толькі з заробкам вяскоўцаў, які якраз напярэдадні Новага года выплацілі ў гаспадарках раёна за некалькі месяцаў. Лічы, падарунак зрабілі, каб і селяніну было за што купіць нешта да сваёй скваркі. І накуплялі людзі, напакавалі валізы і пакеты, а калі дзень пераваліў на другую палову і пачало змяркацца, падаўся вясковы люд на вакзал, каб паспець на свае аўтобусы. Да вяскоўцаў і гараджан нямала далучылася. І таксама не з пустымі торбамі ехалі да сваякоў у госці. Вось і аўтар гэтых радкоў, не з такой ужо, праўда, і важкай сумкай праз плячо, паспяшаўся на аўтобус, які павінен ехаць да Смаўжоў. Аднак за 15 хвілін да яго адпраўлення квіткоў у касе ўжо не прадавалі. А на пасадачнай пляцоўцы людзей сабралася столькі, што было відавочна — усе яны ў адзін "ЛАЗ" не ўлезуць. Хоць гэтыя нязносныя старыя машыны, здаецца, могуць убіраць у сябе пасажыраў, як гумовы шар ваду. І вось такі аўтобус з шыльдачкай "Слонім – Смаўжы" выруліў на пасадачную пляцоўку. Праўда, адразу гэта зрабіць шафёру не ўдалося, бо частка пасажыраў рынулася да аўтобуса, калі ён яшчэ знаходзіўся на стаянцы, як толькі вадзіцель прыйшоў і адкрыў дзверы, каб упусціць у салон дзвюх кантралёрак. Але манёўр у самых нецярплівых заняць свае месца ў салоне не ўдаўся. А тым часам заўважна захваляваліся астатнія. І калі аўтобус быў, нарэшце, пададзены на пасадку і дзверы адчыніліся, — вось тут і пачалося. Штурм! Стыхійнае бедства! Тэракт! Любыя параўнанні былі б да месца. Людзі лезлі, пхнуліся, шчыміліся ў вузкія дзверы са сваімі клункамі адной вялікай жывой масай, зусім не зважаючы адзін на аднаго, каб толькі заняць свае сядзячае, стаячае ці вісячае месца, як быццам ад гэтага залежала іх жыццё. Супраціўленне кантралёрак было зламана літаральна за некалькі хвілін. І калі б на той час нехта з замежных даследчыкаў менталітэту беларусаў хацеў бы на канкрэтным прыкладзе ўбачыць такія рысы нашага нацыянальнага характару, як напорыстасць у дасягненні мэты і здольнасць пераадольваць перашкоды, — то лепшага прыкладу не трэба. Але колькі ні напіралі ўсе разам, а хтосьці павінен быў застацца на вуліцы. Бо "ЛАЗ" усё ж не гумовы. І калі дзверы ўжо зачыняліся, каля іх апынулася маладая жанчына з трыма малымі дзецьмі, клункамі, мужам і без квіткоў. Жанчына пачала браць аўтобус катэгарычнымі пярэчаннямі кантралёркам, што яна з сям'ёй тут не застанецца.

Першымі ў салоне дзіўным чынам апынуліся дзеці, потым яна сама, затым муж перадаў багаж, а з салона вываліліся кантралёркі, перакладаючы ўсю адказнасць за праезд без квіткоў на вадзіцеля, і... дзверы зачыніліся перад самым носам у мужа жанчыны. Ды няпраўду часам кажуць, што нашы жанчыны самі кідаюць сваіх мужоў. Перапоўнены да немагчымасці аўтобус не зрушыўся з месца, пакуль жанчына не дабілася ад шафёра, каб той адчыніў дзверы, і бедны муж апошнім уціснуўся ўсярэдзіну... Помнік патрэбна паставіць такой жанчыне. Калі ж аўтобус не па сваіх гадах і напоўненасці прытка рвануў з месца, тыя, хто застаўся, мацюкаліся, узгадваючы маці, бога і асабліва "бацьку", а кантралёркі лаялі ўсіх разам, нечакана падумалася: а каго ўсё ж "пасуць" нашы кантралёры? І гэтыя аўтобусныя, калі добрая палова пасажыраў паехала без аплаты, і тыя "кантралёры "з верху", якія арганізавалі (і не толькі перад навагоднімі святамі) перавозку людзей, як быдла ў скатавозцы.

Каго яны "пасуць"?.. Пытанне не такое ўжо і простае, так адразу і не адкажаш.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФІНАНСЫ

ЕЎРА ЎЖО Ў СЛОНІМЕ

З 1 студзеня ў Еўропе пачалася эпоха еўра. Беларусь таксама не засталася ў баку ад гэтага працэсу — як-ніяк, а таксама еўрапейская дзяржава.

Многія слонімцы, якія шмат чулі пра еўра па тэлебачанню, радыё, з прэсы, яшчэ на мінулым тыдні намагаліся набыць новыя грошы. Але ім гэта зрабіць не ўдалося, бо банкі ў Слоніме з наяўнымі еўра яшчэ на той час не працавалі.У сувязі з гэтым карэспандэнт "ГС" звярнуўся да ўпраўляючага "Прыорбанка" Аляксея Матача і выконваючага абавязкі ўпраўляючага "Беларусбанка" Аляксандра Лагуціка.

— Аляксей Антонавіч, скажыце, калі ласка, калі ў Вашым банку з'явіцца еўра?

— У "Прыорбанку" новая еўрапейская валюта еўра з'явіцца 10 студзеня. Таму слонімцы ў гэты і наступныя дні могуць у нас яе купіць.

— З 1 студзеня ў Беларусі ўступілі ў сілу новыя нарматывы банкаўскай дзейнасці. Што яны сабой уяўляюць?

— Яны прадугледжваюць істотнае ўзмацненне правіл работы айчынных банкаў. У прыватнасці, у сувязі з новымі правіламі павялічаны памер мінімальнага ўстаўнога фонду. Для айчынных банкаў ён устаноўлены ў памеры Eur 2 млн. Для банкаў з замежнымі заснавальнікамі – не менш Eur 5 млн. Найбольш жорсткія патрабаванні прад'яўляюцца да банкаў, якія плануюць працаваць з фізічнымі асобамі. Мінімальны памер уласных сродкаў для такога банка вызначаны ў Eur 10 млн.

— Аляксандр Анатольевіч, а ў "Беларусбанку" калі з'явіцца еўра?

— У нашым банку еўра з'явіцца дзесьці 10-11 студзеня. Нам выдзелена пэўная сума еўра, ужо ўстаноўлены курс і нават ёсць ліміт на продаж. Таму слонімцы ў бліжэйшыя дні могуць купіць ці абмяняць каля 5 тысяч еўра.

— Ці можна сёння ў вашым банку купіць, напрыклад, нямецкія маркі ці абмяняць іх на беларускія рублі?

— Нямецкія маркі ў нас з абароту выведзены, аперацый з імі мы ўжо не праводзім. З 15 студзеня будзе прыём марак на камісію ці абмен на еўра. Таму, хто прынёс у банк нямецкія маркі, мы выдаем адпаведны дакумент, што "Беларусбанк" узяў маркі, і праз пэўны час мы іх памяняем на еўра ці беларускія рублі.

— Які на 5 студзеня курс еўра ў адносінах да беларускага рубля?

— Па курсу Нацыянальнага Банка Беларусі 1 даляр сёння каштуе 1582 рублі, а 1 еўра –1427 рублёў. Але існуе тэндэнцыя на павялічэнне курса еўра, за пару дзён ён падаражэў на 27 рублёў. Я, як банкір, лічу, што ў еўра ёсць будучыня. Дарэчы, для нашых кліентаў у "Беларусбанку" маюцца пэўныя каляровыя даведнікі па новых еўрапейскіх грошах, іх можна ўзяць пачытаць, паглядзець, а таксама атрымаць неабходную кансультацыю ў работнікаў банка.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННЕ

ШКОЛЬНІЦА РАЗЫШЛАСЯ НЕ НА ЖАРТ

Дзевяцікласніца адной са слонімскіх школ набіла дзвюх студэнтак.

Гэта здарылася ў Альбярціне на вуліцы Паркавай. Адной студэнтцы было 18 гадоў, другой – 19. Прыйшлося па дапамогу звярнуцца ў міліцыю.

Сяргей ЧЫГРЫН

КОНКУРС

ГАЛОЎНЫ ПРЫЗ ДАСТАЎСЯ МІКАЛАЮ БЛІЗНЮКУ З САСНОЎКІ

6 студзеня ў слонімскім кінатэатры "Мір" адбыўся розыгрыш прызоў сярод падпісчыкаў "Газеты Слонімскай" на першае паўгоддзе 2002 года.

На сустрэчу прыйшло больш за сотню чытачоў нашай газеты, хаця на конкурс было прыслана 374 падпісныя квіткі. Найбольш за ўсё пажадалі ўдзельнічаць у конкурсе чытачы са Слоніма і Слонімскага раёна – гэта 290 чалавек. З Зэльвеншчыны паўгадавыя падпісныя квіткі на конкурс даслалі 35 падпісчыкаў, з Дзятлаўшчыны – 27, з Мастоўшчыны – 6. Былі квіткі ад нашых падпісчыкаў з Мінска, Гомеля, Дзяржынска, Шчучына, Валожына, Мар'інай Горкі і іншых гарадоў Беларусі. Перад пачаткам розыгрышу перад чытачамі выступілі галоўны рэдактар "Газеты Слонімскай" ВіктарВаладашчук і кіраўнік слонімскай фірмы "Тэхналогія", якая прадаставіла нам свае прызы, Сяргей Данько. Пасля іх выступлення пачаўся розыгрыш прызоў. Разыграць іх дапамагалі дзеці, якія разам са сваімі бацькамі прыйшлі на сустрэчу. Па чарзе круцілі барабан і выцягвалі квіткі Маргарыта Нікіціна, Ігар і Кацярына Брукішы, Саша Траценка. Шчаслівчыкамі ў той дзень аказаліся тыя, хто не прысутнічаў на розыгрышы.

Галоўны прыз, мікрахвалевая печ "Samsung", выпаў на долю Мікалая Блізнюка з вёскі Сасноўка Слонімскага раёна. Пыласос "LG" дастаўся слонімцу Якубовічу І.Л. Кухонны камбайн "Philips" атрымае жыхар Прырэчнага завулка са Слоніма спадар Куроўскі С.Я. Міксер "Philips" будзе ўручаны сланімчанцы Таццяне Сяргееўне Гардзіенка. Кававарка "Moulinex" выпала спадарыні Крывашэінай Л.В. са Слоніма. Блендзер "Moulinex" атрымае Мукасей С.В. з вуліцы Анішчыка, што ў Слоніме. Фен "Philips" дастаўся сланімчанцы Сяргушкінай з вуліцы Пушкіна. Патэльні "Tefal" атрымаюць: Валянціна Жук (Слонім, зав.2-гі Лясны), Баравік З.І. (Слонім), Іван Карась (вёска Сурынка Слонімскі раён), Кукла С.С. (Зэльва), Карповіч Г.В. (Слонім, вул. Паркавая), Валянціна Беладзед (вёска Сянькоўшчына Слонімскі раён).

Калектыў рэдакцыі "ГС" шчыра віншуе тых, каму дасталіся гэтыя прызы. І просіць прыйсці ў нядзелю, 13 студзеня, у 14 гадзін у рэдакцыю "Газеты Слонімскай" (вул.- Камсамольская, 8), дзе ім будуць уручаны прызы. Просьба не спазняцца і мець пры сабе дакумент, які пацвярджае вашу асобу. А тым, каму не пашанцавала ў нашым конкурсе, адчайвацца не трэба. Наперадзе будуць новыя конкурсы і гульні, у якіх, мы спадзяемся, перамажаце і вы. Шчасця ўсім, здароўя, дабра, няхай збываюцца ўсе вашы мары. Да сустрэчы на старонках "ГС".

Сяргей ЧЫГРЫН,
фота Віталя ГІЛЯ

ПРАБЛЕМА

НІ ДАЙСЦІ, НІ ДАЕХАЦЬ

Жанчына з рыдлёўкай — лепшы ачышчальнік

Надзвычай снежная зіма 2001 – 2002 гадоў прынесла шмат клопатаў транспартнікам і дарожным службам.

І калі з гарадскіх вуліц снег збольшага ўбіраецца, а таксама чысціцца асноўныя аўтамагістралі, то да некаторых вёсак Слонімскага раёна літаральна ні дайсці, ні даехаць.

Маюцца на ўвазе такія невялічкія вёсачкі, як, напрыклад, Завершa Жыровіцкага сельсавета ці Сяргеевічы Азгінавіцкага. Менавіта ад жыхароў гэтых вёсак паступалі скаргі ў рэдакцыю нашай газеты на поўнае бездарожжа. А жывуць у тым жа Завершы і Сяргеевічах, у асноўным, пенсіянеры, для якіх і па добрай дарозе праблема дайсці да крамы купіць хлеба. (У Завершы, дарэчы, у мінулым годзе і краму зачынілі.). Дарожнікі ледзьве спраўляюцца, каб вызваліць ад снегу галоўныя аўтамагістралі раёна. Дарогі паміж асобнымі вёскамі найчасцей з'яўляюцца аб'ектамі мясцовых калгасаў. А ў сельскіх гаспадарках паліва для тэхнікі ледзьве хапае, каб абслугоўваць фермы. І калі яшчэ знаходзіцца магчымасць неяк расчысціць вуліцы і дарогі калгаснага цэнтра, то пускаць бульдозер у аддаленыя вёскі, дзе, як правіла, жывуць адны пенсіянеры, – сабе даражэй.

Атрымліваецца, як гэта бывае зараз у многіх галінах і сферах нашага жыцця, такое вось замкнутае кола, абумоўленае хранічнай беднасцю большасці гаспадарак раёна. Але, калі паглядзець з іншага боку, нельга так запраста адгарадзіцца ад жыхароў неперспектыўных вёсак аб'ектыўнымі прычынамі. Бо яны ж таксама людзі і заслужылі хаця б добрай дарогі, каб дайсці да крамы ці аўталаўкі.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПОЧТА

"Иван кивает на Петра", А ДЕНЕЖКИ ВЫКЛАДЫВАТЬ НАРОДУ...

"Уважаемый председатель Слонимского городского исполнительного комитета тов. Лактюшин О. Н.

Обращается к Вам за разъяснениями житель г. Минска, Савицкий П. П.. Я был несказанно удивлен, когда проехал в вашем городском транспорте 1 января 2002 года. Оказывается, у вас на праздники в 2 раза подорожал проезд в общественном транспорте, в то время как в Минске тарифы на проезд остались прежние: полный проезд – 80 рублей, льготный – 40 рублей, при продаже проездных билетов водителем – 100 рублей. У вас же проезд в воскресенье и праздничные дни составил: полный – 160 руб., льготный – 80 руб.

Я разговаривал по телефону с Вашим замом, тов. А. В. Беляниным , он мне дал ответ, что это решение "местных" депутатов. А чем депутаты, народоизбранные, руководствовались, принимая такое решение? Я не знаю, какая зарплата у депутата, но думаю, не меньше 40 тысяч рублей. У меня теща отработала в медицине 40 лет, у нее пенсия 40 тысяч. Из этих денег ей нужно оплатить коммунальные услуги, квартплату, купить какую-нибудь одежонку, обувку, а еще нужно и покушать.

Но возвращусь к 1 января 2002 года. Проехав в городском транспорте маршрутом №3 "МРЗ – Больница", я наблюдал реакцию пассажиров. Идет кондуктор по салону: "Оплачивайте проезд". В ответ раздаются слова: "Проездной, удостоверение", никто из пассажиров не думал оплачивать двойной тариф. Вы можете возмутиться, что, мол, приехал тут и начинает нас жизни учить. Дело в том, что такая жизнь у нас везде в республике. Ну, может быть, в столице начальство немного побаивается. Народ ведь терпит до поры до времени, а потом наступит и такой час, что начнет воздавать всем по заслугам. Не минут этой раздачи и депутаты в районах и областях.

Петр САВИЦКИЙ,
Минск."

"Председателю Слонимского городского исполкома
Председателю Слонимского городского Совета депутатов

С 1 января 2002 года решением Слонимского городского исполнительного комитета повышена стоимость проезда в общественном транспорте в воскресные и праздничные дни. Принятая мера призвана поднять доходность автопредприятия, снизить увеличивающиеся затраты, а в целом – для сохранения маршрутной сети города. Однако, на основании многочисленных обращений избирателей, депутаты-коммунисты Слонимского городского Совета депутатов, Слонимский районный комитет Партии коммунистов Белорусской призывает Слонимский горисполком пересмотреть принятую непопулярную меру поддержки местного автопредприятия из итак тощего кошелька горожан. Принятые меры нами рассматриваются как дальнейшее наступление на экономические интересы наших сограждан. Мы также считаем, что этот вопрос, затрагивающий непосредственные интересы избирателей, должен быть вынесен на сессию городского Совета депутатов. Педагоги, труженики села, работники культуры и медицины, рабочие предприятий, имеющие и так низкие доходы с частыми задержками заработной платы просто будут не в состоянии нести и этот дополнительный груз на себе, что в свою очередь может отразиться на существующем спокойствии в обществе.

Со своей стороны мы уверены, что возникший вопрос о сохранении маршрутной сети города можно решить не только увеличением стоимости проезда, а и более рациональным использованием автотранспорта, повышением ответственности водителей за трудовую дисциплину и вводом отдельных, но не более 25%, автобусных маршрутов, работающих в режиме маршрутного такси.

По поручению избирателей
и Слонимского РК ПКБ
Виктор ГЕРАСИМЧИК,
первый секретарь
Слонимского РК ПКБ,
депутат городского Совета
депутатов

ПОЧТА

МОЛОЧНАЯ КУХНЯ МОГЛА БЫ НАКОРМИТЬ ВСЕХ ДЕТОК

Слонимская молочная кухня по улице Брестской была открыта в 1983 году, и по сегодняшний день она является единственной в своем роде в Беларуси.

В советском прошлом молочная кухня процветала. Новейшее оборудование, большие помещения, склады, высокий спрос на детское питание, 11 человек обслуживающего персонала.

Пять лет назад произошло первое сокращение – на кухне осталось 6 человек. Из года в год сокращалось количество клиентов, изнашивалось оборудование, росли цены на детское питание. На сегодняшний день молочная кухня обслуживает 60 человек, из которых 55 получают питание бесплатно. Главными клиентами по-прежнему остаются родильное, детское и инфекционное отделения Слонимской районной больницы.

Еще несколько лет назад кухня обслуживала ясли и детские сады. Однако, из-за отсутствия транспорта детские сады отказались от молочных услуг. Теперь вместо творога и стерилизованного кефира дети пьют кефир, привозимый прямо с мелкооптовой базы. Да и молодые мамы предпочитают кормить своих детей кашками и смесями собственного приготовления. Оно, мол, надежнее. Хотя, если сравнивать надежность, то молочная кухня со стерилизацией бутылочек, начальных продуктов и готового питания даст 100 очков вперед.

К тому же, и дешевле выйдет. Например, полный стол, состоящий из четырех каш, трех смесей, творога, пюре и сока обойдется в 20 тысяч рублей в месяц. А покупка смесей и сухих каш в магазине – в 16 тысяч рублей. А ведь малышу нужны и творожок, и мясные консервы, и соки. В итоге, в месяц выйдет около 35 тысяч рублей.

К сожалению, из-за отсутствия специальной морозильной установки санэпидемстанция запретила молочной кухне готовить мясной фарш и мясные бульоны. В связи с этим, кухня потеряла основную часть своих заказчиков.

Однако, ассортимент изготавливаемого питания и без мясных блюд достаточно широк: молочные смеси, каши из всевозможных круп, кальцинированный творог, диет-соя, разнообразные пюре, соки, кисели, кефир, молоко. Такого изобилия продуктов нет больше ни на одной молочной кухне в республике.

Что получается сегодня. Шестьдесят порций и обслуживание трех отделений районной больницы не окупают затраты на электричество, отопление. Нечем платить за ремонт изношенного и вечно ломающегося оборудования, не говоря уже о том, чтобы приобрести новое. Да и зарплату сестрам и санитаркам – около 50 000 рублей – выдают с задержкой.

И все же, руководство районной больницы, в штат которой входит молочная кухня, сделало-таки новогодний "подарок" работницам кухни – очередное сокращение. Теперь на молочной кухне будут работать только 2 человека.

Елена ЛЫНЬКО

МАСТЫ

ТВОРЧАСЦЬ САМАДЗЕЙНАГА МАЙСТРА

У мастоўскім музеі "Лес і чалавек" адкрылася выстава самадзейнага разбяра па дрэву настаўніка Радзявіцкай базавай школы Здзіслава Стасевіча.

Наведвальнікі могуць пабачыць не толькі арыгінальныя рамкі для абразоў, але і разнастайныя стальніцы,паліцы, сальнічкі, куфэрачкі, вешалкі, нават шашкі. Гэтым рэчам хатняга ўжытку рука майстра надала незвычайны ўзор, і ён вабіць вока чалавека.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗЛІКВІДАВАНА АПОШНЯЕ СЕЛЬПО

Услед за Луненскім сельпо зліквідавана і Курылавіцкае.

Зараз адзіным гандлёвым прадпрыемствам па забеспячэнню вяскоўцаў прадуктамі харчавання і прамысловымі рэчамі застаецца Мастоўскае ГарПО.

Антон МАКЕЙ

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ДАМАГЛІСЯ СВАЙГО

Мастоўскія прадпрымальнікі зноў дамагліся магчымасці гандляваць у будзённыя дні на міні-рынку.

Так паабяцаў ім старшыня райвыканкама Аляксандр Кісялёў, толькі з некаторымі зменамі. Тыя, хто гандлюе харчовымі таварамі, застануцца на сваім месцы, а для тых, хто прадае рэчы, будзе прадстаўлена частка бліжэйшай вуліцы.

Антон МАКЕЙ

ВІТАМІНЫ ДЗЕЦЯМ

Мастоўскае аддзяленне дабрачыннай арганізацыі фонду "Дзецям Чарнобыля" размеркавала сярод дзяцей горада значную партыю вітамінаў.

Груз прадставіла адна са сталічных дабрачынных арганізацый.

Антон МАКЕЙ

ДЭМАГРАФІЧНАЯ СТАТЫСТЫКА

За мінулы год у Мастах зарэгістравана 212 шлюбаў.

Сёлета першая пара будзе зарэгістравана толькі 29 студзеня, пасля заканчэння ўсіх святаў. За 2001 год у горадзе нарадзілася 224 дзіцяці, а памерла 204 гараджаніна.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НЯБОЖЧЫКА ЗНАЙШЛІ ЛЯ ВЁСКІ

Раніцай першага студзеня каля вёскі Стукалы знойдзены труп.

Прычыны смерці высвятляецца.

Антон МАКЕЙ

УЗНАГАРОДЗІЛІ

Гродзенскі абласны камітэт узнагародзіў Ганаровай граматай аблвыканкама дырэктара спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерва №1 Пятра Станіслававіча Рудзевіча.

Гэтай пашаны ён заслужыў за высокія дасягненні па падрыхтоўцы спартсменаў-весляроў на байдарках і каноэ.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗІМОВЫ РАМОНТ

Камунальныя службы горада распачалі рамонт пад'ездаў некаторых дамоў па вуліцы К. Цэткін, нягледзячы на тое, што на вуліцы зіма, і пад'езды не маюць ацяплення.

Нягледзячы на нізкую эфектыўнасць такога рамонту, жыхары ўсё роўна задаволены, бо там рамонт не праводзіўся на працягу 15 гадоў.

Антон МАКЕЙ

ЗЭЛЬВА

КАЖУЦЬ АДНО – РОБЯЦЬ ІНШАЕ

Паслухаеш беларускае радыё, паглядзіш белтэлебачанне. Толькі і чуеш: клопаты і клопаты пра людзей і, асабліва, пра вяскоўцаў-хлебаробаў, пра нямоглых і інвалідаў. Вось і задумаешся, што гэта – замбіраванне, адурманьванне ці ліпавы імідж Самаму-самаму...

А на самай справе далёка хадзіць не трэба, а можна проста заглянуць у магазін вёскі Мадзейкі, што на Зэльвеншчыне.

Чакаю прывозу хлеба. Чакаў у 10-11 гадзін, а прывезлі ў палове пятай гадзіны. А вось 31 снежня люд чакае свята, Новага года. Патрэбна, як кажуць, хлеб і да хлеба. Рыбнай кансервы няма, няма ні коржыкаў, ні піражкоў, ні бублікаў і г.д. Ды што там гаварыць пра іншае, калі хлеб, які завецца чамусьці "Свежым" трапіў у магазін толькі ў 18 гадзін. А ў магазін вёскі Пасуцічы – у 19. Уявіце, цэлы дзень прыйшлося чакаць хлеба прадаўцам, пакупнікам, абслузе кволых пенсіянераў-хлебаробаў. Ці не здзекі? А той, што трохі лягчэйшы на пад'ём, паехаў па бохан хлеба ў Ваўкавыск.

У гэты дзень так і не дачакаліся хлеба нямоглыя, якія на абслузе райсацзабеспячэння. Абышліся бульбаю. Вось вам і Новы год. Прыйшоў ён з новымі праблемамі. Праблемамі для ўсіх, а для састарэлых – тым больш, для нямоглых – новымі пакутамі. А вось вёска Забагонне, дзе магазін зліквідавалі, засталася з цэлай кучай праблем: ні хлеба, ні вады (ваду адключылі), ні добрай дарогі — замяло-завеялазанясло. Ачышчальныя машыны сюды чамусьці не трапляюць. Падобнае становішча ў вёсках Сухінічы і Вішняўка, там таксама зліквідавалі магазіны, мауляў, па прынцыпу " няма магазінаў – няма праблем". А люд як-небудзь сам перабʼецца...

Мараль па Дарвіну: выжывае мацнейшы. Адбор у прыродзе, барацьба за існаванне. Такой думкі, як бачым, прытрымліваецца і "вертыкальная" каманда Эльяшэвіча – старшыні Зэльвенскага райвыканкама. Ці мо ў яе іншыя акалічнасці, скажам, – "службовае бяссілле" ці "якое жыццё без праблем". А мо, адхінуліся ад люду? А што ім люд... У іх праблем няма: добры заробак, цяпло, хлеб і да хлеба.

Іван ЦІМАФЕЙЧЫК

ФОТАФАКТ

Фота Віталя ГІЛЯ

Перемена в Первомостовской спецшколе-интернате

СЛОНІМ

ПЕРШЫЯ НЕМАЎЛЯТЫ

У першыя восем дзён новага 2002-га года ў акушэрскім аддзяленні Слонімскай бальніцы з'явілася на свет 10 дзяцей.

Сярод народжаных – пяць хлопчыкаў і пяць дзяўчынак. Прычым, першае немаўля нарадзілася 1 студзеня каля другой гадзіны ночы. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведаміла загадчыца акушэрскага аддзялення Раіса Арочка.

Сяргей ЧЫГРЫН

СУДОВАЯ СТАТЫСТЫКА

У мінулым, 2001 годзе, Слонімскім судом было вынесена рашэнняў па крымінальных, грамадзянскіх і адміністрацыйных справах агульнай колькасцю 3573 рашэнні. У 2000 годзе такіх рашэнняў было 3685.

Такім чынам, у 2001 годзе назіралася нязначнае зніжэнне колькасці судовых пакаранняў. А па характару спраў атрымліваецца наступны малюнак:

	2000г.	2001г.
Крымінальныя	**409**	**346**
Грамадзянскія	**1015**	**1101**
Адміністрацыйныя	**2261**	**2126**

Як бачым, паменела ў мінулым годзе крымінальных і адміністрацыйных пакаранняў, але вырасла колькасць грамадзянскіх спраў.

Мікола КАНАНОВІЧ

МАСТЫ

УДАКЛАДНЕННЕ

У мінулым нумары "ГС" (№1)была змешчана заметка " Бацькам не даюць заробак, дзецям — падарункаў", дзе адзначалася, што напярэдадні Новага года дзецям рабочых вытворчага аб'яднання "Мастоўдрэў" не далі падарункаў. Аднак, як аказалася, гэты факт не адпавядае сапраўднасці. Як сказаў старшыня прафкама аб'яднання Мікалай Раінчык, для дзетак работнікаў "Мастоўдрэў" было закуплена каля 3000 падарункаў на агульную суму 11 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, для маленькіх мастаўчан былі арганізаваны навагоднія ранішнікі, на якія таксама была выдаткавана пэўная сума грошай.

У сувязі з гэтым "Газета Слонімская" просіць прабачэння ў прафкама і адміністрацыі "Мастоўдрэў" за недакладнасць інфармацыі.

МАСТЫ

АДКАЗНЫЯ ЛІСТЫ ГРОДЗЕНСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

Арганізатары і ўдзельнікі мітынгу ў абарону працоўных, які адбыўся ў Мастах у пачатку лістапада мінулага года, атрымалі ад Гродзенскага аблвыканкама адказ на прынятую на сходзе рэзалюцыю.

У рэзалюцыі гаварылася пра адсутнасць у горадзе гарачай вады, незаасфальтаванасць вуліц, адсутнасць дзіцячых пляцовак, затрымку заработнай платы і іншае, ды выказваўся недавер раённаму кіраўніцтву. Як стала вядома з адказу, факты былі разгледжаны з выездам на месца, прычым ніхто з арганізатараў і ўдзельнікаў мітынгу не быў запрошаны для высвятлення абставін. Далей у адказе ідзе пералік поспехаў народнай гаспадаркі раёна. Удзельнікі мітынгу, відаць, не ведалі, што ўраджайнасць зерневых у раёне склала 33,1 ц з га, бульбы—156 ц, цукровых буракоў—338 і г.д. Адказ сцвярджае, што ўсе прамысловыя прадпрыемствы раёна, акрамя ААТ "Мастоўдрэў", перавыканалі прагнозныя паказчыкі за 11 месяцаў. Згодна адказу аблвыканкама, стабільна працуе ўнітарнае прадпрыемства бытавога абслугоўвання раёна, хоць месяц таму назад на сесіі Мастоўскага райсавета старшыня райсавета Г. Каробка канстатаваў, што прадпрыемства неплацежаздольнае.

Далей былым удзельнікам мітынгу стала вядома аб тым, што рэгулярна выплачваецца заработная плата. Тут як намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы аблвыканкама С. Хацук сцвярджае, што будзе выканана гадавая праграма будаўнічага комплексу раёна за кошт увядзення ў эксплуатацыю двух "аднакватэрных жылых дамоў" , у якіх пасяліліся старшыня райвыканкама А. Кісялёў і яго першы намеснік С. Штарноў. Каб мастаўчане не мелі ніякіх прэтэнзій да свайго кіраўніцтва, патлумачана, што будаваліся катэджы за сродкі абласнога бюджэту. За год у горадзе здзейснены ямачны рамонт 16 вуліц, а на правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў грошы з раённага бюджэту не выдаткоўваліся, і гарачая вада паступае па графіку.

І ўвогуле мастаўчане жывуць добра.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ГРОДНА

"ПАГОНЮ" ВНОВЬ ОБВИНЯЮТ В КЛЕВЕТЕ

Прокуратура Гродненской области продлила расследование уголовного дела о клевете в отношении президента Республики Беларусь (статья 367, часть 1 Уголовного кодекса), которое было возбуждено против редактора газеты "Пагоня" Николая Маркевича и журналиста Павла Можейко.

Дело было возбуждено 5 сентября 2001 года по факту публикаций в газете материалов, по мнению прокуратуры, содержащих клевету в отношении Александра Лукашенко. А 12 ноября, как известно, газета была закрыта по решению Высшего хозяйственного суда Беларуси. Следствие проводил следователь областной прокуратуры Олег Кулевич. 5 января Н.Маркевич и П.Можейко были вызваны на допросы в прокуратуру. Однако допросы были неожиданно отменены, и сотрудник прокуратуры сообщил журналистам, что они будут вызваны позже.

По словам Николая Маркевича, из беседы со следователем у него сложилось впечатление, что он и сам не знает, как в дальнейшем будет развиваться это дело, и что не следователь решает его ход. По мнению главного редактора, основная сложность, стоящая перед следствием — это фактическое отсутствие потерпевшего. Лукашенко должен в определенном законом порядке признать себя потерпевшим от публикаций в газете. И власти колеблются, как поступить. С одной стороны, считает Маркевич, прекратить уголовное дело — значит, признать свою неправоту и нести ответственность за многочисленные нарушения закона, за материальный урон, нанесенный газете (изъятые 4 компьютера и более 3 тонн бумаги). Но с другой стороны, по мнению Маркевича, дело не имеет судебной перспективы и рассыплется во время суда. Журналисты же, по мнению редактора, только выигрывают от уголовного преследования перед лицом общественного мнения. Тем более, что газета в электронном варианте продолжает выходить в интернете. Поскольку власти, по словам Маркевича, рассчитывали, что коллектив после закрытия издания распадется, а этого не произошло, в отношении журналистов будут продолжаться различные провокации, чтобы дискредитировать их и разрушить редакционный коллектив.

Геннадий БАРБАРИЧ

ЛЕВЫЕ ГОТОВЯТСЯ К АКЦИИ ПРОТЕСТА

Конфедерация "За социальные перемены", включающая в себя Партию коммунистов, Партию труда, Белорусскую социал-демократическую партию ("Народная Громада"), четыре промышленных профсоюза и ряд других общественных организаций, проведет в Минске и 45 крупнейших городах Беларуси акции протеста против падения жизненного уровня населения.

Инициатива массовых выступлений исходит от Партии коммунистов Белорусской. Согласно статистике, с августа по ноябрь задолженность по зарплате в народном хозяйстве выросла в 25 раз: с 0,5 процента от фонда зарплаты в августе до 12 и более процентов — в ноябре.

В сельском хозяйстве ситуация еще хуже: своевременно зарплату не получили 80 процентов сельчан. Одновременно сильно выросли потребительские цены. Если за три месяца до сентябрьских президентских выборов цены выросли на 4,6 процента, то за три месяца после выборов рост составил уже 10 с лишним процентов.

По статистическим сведениям, свыше 90 процентов семей Беларуси все заработанные деньги тратят на питание.

ПРИМА

ОЖИДАЕТСЯ ПОТЕПЛЕНИЕ

По прогнозам Министерства по чрезвычайным ситуациям, в 2002 году в Беларуси сократится число пожаров и возрастет количество природных чрезвычайных ситуаций.

Фота Віталя ГІЛЯ

В беседе с корреспондентом БелаПАН первый заместитель министра Энвер Бариев отметил: в своих прогнозах они исходят из того, что за 2001 год в сравнении с 2000 годом число пожаров сократилось примерно на 10 процентов.

По мнению г-на Бариева, подобная динамика свидетельствует о способности сил и средств МЧС реально влиять на ситуацию. По его словам, в стране начинается широкая кампания по контролю за состоянием электропроводки и печей, а также оборудования жилых домов и отдельных квартир автономными пожарными звуковыми сигнализаторами, что позволит в семи случаях из десяти предотвращать гибель людей. Причем, в первую очередь, эти приборы будут устанавливаться в помещениях, где проживают престарелые, многодетные семьи и инвалиды.

Вместе с тем, как заметил г-н Бариев, в будущем году ожидается рост количества природных ЧС — ураганных ветров и мощных наводнений. По мнению специалистов, такая тенденция вызвана нарастающим экологическим дисбалансом, вызванным антропогенными и естественными факторами. Среди них — потепление климата и нарушение озонового слоя, добыча полезных ископаемых и движение земной коры. Так, на территории Беларуси ученые ежегодно отмечают до 20 подземных толчков.

Кроме того, как отметил г-н Бариев, "в высокоизношенном состоянии" находятся основные производственные фонды страны, в том числе нефтехимический комплекс, предприятия легкой промышленности, а также производства, использующие сильнодействующие яды и пожаровзрывоопасные вещества.

Марат ГОРЕВОЙ

ПИКЕТ ОППОЗИЦИИ В МИНСКЕ

В Минске, на перекрестке улиц Красивой и Могилевской, прошел пикет, посвященный 50-летию со дня рождения бывшего министра внутренних дел Беларуси Юрия Захаренко.

Два с половиной года назад, в мае 1999-го, именно на этом месте поздним вечером генерала похитили неизвестные. Пикет является составной частью ряда подобных акций под общим названием "Цепь неравнодушных людей".

Несмотря на мороз и ветер со снегом, на пикет собралось около 30 членов Объединенной гражданской партии, одним из руководителей которой был в свое время Юрий Захаренко, и активистов оппозиционного молодежного движения "Зубр".

Они простояли более получаса около универсама "Могилевский", держа в руках портреты бесследно пропавшего политика. Реакция многочисленных прохожих была самой различной: от полной поддержки участников акции (несколько человек даже сами брали портреты и становились в шеренгу "неравнодушных") до активного неприятия и возмущения.

ПРИМА

ОСТОРОЖНО: ДОЛГОЛЕВ!

2 декабря прошлого года на трассе Брест-Минск машиной, в которой ехал председатель Брестского облисполкома Василий Долголев, был насмерть сбит мужчина.

Весной того же года служебный автомобиль Долголева, в котором находился и сам хозяин, сбил молодую учительницу. Тоже насмерть. Сегодня в Бресте рассказывают про третью (но по счету — вторую) аварию, совершенную с участием Долголева. Мол, буквально через несколько месяцев после первой автокатастрофы машина Василия Борисовича слегка помяла бока еще одному пешеходу. До летального исхода, к счастью, не дошло. Некоторые утверждают, что в двух последних случаях Долголев вел машину сам. И якобы в нетрезвом состоянии.

Корреспондент "Народной воли", выехав на место происшествия, попыталась выяснить некоторые подробности и причины этих несчастных случаев.

ХАРТИЯ-97

ШАХТЕРЫ НЕ СОГЛАСНЫ С ПРАВИТЕЛЬСТВОМ

11 января в Солигорске (Минская область) планируется проведение крупного митинга в знак протеста против правительственного постановления от 14 декабря "О мерах по защите прав членов профессиональных союзов".

Как сообщили в Федерации профсоюзов Белорусской, санкционированный митинг пройдет на солигорском стадионе "Строитель" с 15.30 до 17.30, в нем планируется участие до 10 тысяч человек.

Предполагается, что основную массу митингующих составят работники ПО "Беларуськалий" — крупнейшего предприятия региона, одного из ведущих в стране экспортеров. Профсоюзный комитет этого предприятия одним из первых публично высказал протест по поводу данного постановления, выступив с заявлением.

БелаПАН

БЕЛАРУСЬ ПЕРЕЙДЁТ НА ПАРТНЁРСКИЕ ОТНОШЕНИЯ МЕЖДУ ВРАЧОМ И ПАЦИЕНТОМ

В 2002 году Беларусь начнет переход от 100-процентной государственной опеки по охране здоровья к модели общественного здравоохранения, то есть к партнерским отношениям между врачом и пациентом.

Об этом БелаПАН сообщил начальник главного управления лечебно-профилактической помощи Минздрава Александр Цыбин.

По его словам, бережное отношение граждан к своему здоровью должно оказать существенное влияние на уровень заболеваемости в целом. Уменьшение количества больных ожидается также в случае соблюдения более четких взаимоотношений с медиками в пределах государственных социальных стандартов и гарантий. Эти факторы, как подчеркнул специалист, позволяют прогнозировать снижение уровня сердечно-сосудистых, травматических, венерических, детских заболеваний и туберкулеза.

Александр Цыбин отметил, что за прошедший год в республике сложилась стройная система оказания лечебно-профилактической помощи при сердечно-сосудистых заболеваниях. Однако поскольку этот вид болезней наполовину связан с питанием, бытом и стрессовым ситуациями, для достижения наилучшего результата особенно важна совместная работа медиков и пациентов.

Специалист отметил, что в уходящем году по показателю наиболее высокой смертности "лидировали" заболевания сердечно-сосудистой системы, онкология, а также травмы и несчастные случаи. В новом году, по его словам, скорее всего такие позиции сохранятся. Правда, специалисты не исключают, что смертность в результате травм, несчастных случаев и отравлений может выйти на второе место. На это указывают итоги уходящего года.

БелаПАН

РЕЖИССЕРУ ФИЛЬМА «ГОСТИ» ПРЕДЪЯВИЛИ ОБВИНЕНИЕ И ПОСАДИЛИ В «ПСИХУШКУ»

Режиссеру "Беларусьфильма" Руслану Зголичу предъявили обвинение в краже семи из восьми частей снятого им фильма «Гости».

Зголичу грозит от семи до 15 лет тюрьмы, так как исчезнувшую пленку оценили в 30 тысяч долларов, а это кража в особо крупных размерах. Руслана Зголича после предъявления обвинения сразу же задержали, а потом направили на экспертизу в психиатрический госпиталь.

ХАРТИЯ-97

